**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________________ І. А. Старавойтава

_____________________

Рэгістрацыйны № ТД-____________/тып.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
1-21 03 01 Гісторыя (па напрамках)
1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)
1-23 01 13 Гісторыка-архівазнаўства

УЗГОДНЕНА
Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтва НАН Беларусі
________________ А. А. Каваленя
“___” ____________ 2020 г.

УЗГОДНЕНА
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі
________________ В. М. Здрок
“___” ____________ 2020 г.

УЗГОДНЕНА
Начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________ С. А. Каспяровіч
“___” ____________ 2020 г.

УЗГОДНЕНА
Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”
________________ І. В. Цітовіч
“___” ____________ 2020 г.

Эксперт-нормакантралёр
________________ ____________
“___” ____________ 2020 г.

Мінск 2020

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
М. С. Даўгяла, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Л. А. Козік, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра сусветнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

*Кудраўцава С. А.*, намеснік дырэктара па рэдакцыйна-выдавецкай рабоце Навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, метадыст вышэйшай катэгорыі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай гісторыі паўднёвых і заходніх славян Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 17 ад 28 мая 2020 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 5 ад 17 чэрвеня 2020 г.);

Навукова-метадычным саветам Вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі (пратакол № 3 ад 9 чэрвеня 2020 г.)

Адказны за рэдакцыю: Л. А. Козік
Адказны за выпуск: Л. А. Козік

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Ва ўмовах рэфармавання сістэмы педагагічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь важную ролю ў павышэнні прафесійных кампетэнцый будучых выкладчыкаў адыгрывае веданне новых падыходаў да праблемы навучання гісторыі. Тыпавая праграма па вучэбнай дысцыпліне “Методыка выкладання гісторыі”, прызначана для засваення на першай ступені вышэйшай адукацыі студэнтамі, што навучаюцца па спецыяльнасцях: 1-21 03 01“Гісторыя (па напрамках)”, 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)”, 1-23 01 13 “Гісторыка-архівазнаўства” ва ўстановах вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь. У ёй абноўлены змест, зроблены акцэнт на кампетэнтнасны падыход, значна пашырана самастойная работа студэнта, прадугледжана выкарыстанне інавацыйных педагагічных тэхналогій. У праграме выкарыстаны міждысцыплінарныя сувязі “Методыкі выкладання гісторыі” з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як педагогіка, псіхалогія, філасофія, метадалогія гістарычнага пазнання.

У тыпавой праграме ўлічаны патрабаванні адукацыйнага стандарту да кампетэнтнасці спецыяліста. Такім чынам пры распрацоўцы была ўлічана неабходнасць фарміравання акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да *акадэмічных кампетэнцый* спецыяліст павінен:

АК-1 – умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-4 – умець працаваць самастойна;

АК-5 – быць здольным выпрацоўваць новыя ідэі (крэатыўнасць);

АК-6 – валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;

АК-7 – мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прыладаў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп’ютарам;

АК-8 – мець лінгвістычныя навыкі (вусная і пісьмовая камунікацыя);

АК-9 – умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу жыцця.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да *сацыяльна-асобасных кампетэнцый* спецыяліст павінен:

САК-1 – валодаць якасцямі грамадзянскасці;

САК-2 – быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

САК-3 – валодаць здольнасцю да міжасабовай камунікацыі;

САК-5 – быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне);

САК-6 – умець працаваць у камандзе;

САК-8 – умець фарміраваць уласныя меркаванні;

САК-9 – быць здольным прымяняць атрыманыя веды.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да *прафесійных кампетэнцый* спецыяліст павінен:

ПК-1 – планаваць, арганізоўваць і весці вучэбна-метадычную і навукова-метадычную работу;

ПК-2 – выкарыстоўваць аптымальныя формы і метады навучання;

ПК-2 – развіваць навыкі работу навучэнцаў з вучэбнай, навуковай і навукова-метадычнай літаратурай, гістарычнымі крыніцамі;

ПК-4 – арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў;

ПК-5 – планаваць, арганізоўваць і весці выхаваўчую работу;

ПК-6 – фарміраваць у навучэнцаў навуковыя ўяўленні аб грамадскіх падзеях, развіваць інтарэс да вывучэння гісторыі;

ПК-7 – абагульняць і распраўсюджваць перадавы вопыт арганізацыі выхаваўчай працы;

ПК-8 – фарміраваць пачуццё грамадзярнскасці і патрыятызму, развіваць эстэтычныя ўяўленні і высокія маральныя якасці асобы;

ПК-9 – фармуляваць і вырашаць задачы, якія паўстаюць падчас навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці;

ПК-13 – планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць працу ў працоўным калектыве;

ПК-15 – кантраляваць і падтрымліваць працоўную і вытворчую дысцыпліну;

ПК-16 – складаць дакументацыю па ўстаноўленым формам;

ПК-19 – дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт гледжання, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей;

ПК-22 – мець веды, практычны вопыт для кансультавання ў пытаннях вывучэння гісторыі, арганізацыі даследчыцкай работы і выхаваўчага працэса ў установах адукацыі, навукі і культуры;

ПК-23 – ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывам развіцця інавацыйных тэхналогій;

***Мэта*** вучэбнай дысцыпліны “Методыка выкладання гісторыі” — тэарэтычная і практычная падрыхтоўка будучых настаўнікаў гісторыі. ***Задачамі*** курса з’яўляецца авалоданне студэнтамі асноўнымі тэарэтычнымі ведамі, выпрацоўка ўменняў, неабходных для арганізацыі працэсу навучання гісторыі, выяўленне асноўных адукацыйных, развіваючых і выхаваўчых магчымасцей гісторыі.

У адпаведанасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту да кампетэнцый выпускніка па вучэбнай дысцыпліне “Методыка выкладання гісторыі” выпускнік павінен:

***ведаць:***

– праблематыку і змест методыкі выкладання гісторыі, яе сувязь з іншымі дысцыплінамі;

– асноўныя дакументы, якія рэгулююць выкладанне гісторыі ў сярэдняй школе;

– сутнасць сучасных адукацыйных тэхналогій і асноўныя патрабаванні да іх;

– сучасныя патрабаванні да ўрока гісторыі;

– асноўныя сродкі навучання;

– асноўныя метады навучання гісторыі;

– структуру і тыпалогію урокаў;

– асноўныя віды паўтарэння і методыку іх арганізацыі;

– педагагічны этыкет настаўніка гісторыі, нормы паводзін у педагагічным і вучэбным калектыве;

– крытэрыі ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў;

***умець:***

– складаць каляндарна-тэматычны план, план-канспект і план урока;

– выкарыстоўваць нарматыўныя дакументы і метадычную літаратуру;

– аналізаваць урок з пазіцыі сучасных патрабаванняў да яго правядзення;

– аб’ектыўна ацэньваць веды вучняў;

– фарміраваць гістарычныя веды і ўменні вучняў;

– арганізоўваць працу з крыніцамі на ўроку;

– выкарыстоўваць наглядныя дапаможнікі на ўроках гісторыі;

– арганізоўваць працу з кнігай (падручнікам, хрэстаматыяй, навукова-папулярнай літаратурай і г.д.) на ўроках гісторыі і дома;

– выбіраць метады, прыёмы і сродкі навучання;

– вызначаць мэту і задачы ўрока, яго месца ў сістэме гістарычнай адукацыі;

– вызначаць узровень асобаснага развіцця вучняў;

– выкарыстоўваць розныя формы навучання ў сярэдняй школе;

– арганізоўваць рознаўзроўневае навучанне;

– ажыццяўляць структурна-функцыянальны аналіз вучэбнага матэрыялу;

***валодаць:***

– метадамі нагляднага, вуснага і славесна-друкаванага навучання гісторыі і інтэрактыўнымі метадамі навучання;

– уменнямі праектаваць і прагназаваць сваю педагагічную дзейнасць.

У структуры зместу вучэбнай дысцыпліны вылучаюцца ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі (раздзелы). Па кожным вучэбным раздзеле ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі па фарміраванню і развіццю ў студэнтаў прафесіянальных кампетэнцый выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя лекцыйныя і семінарскія заняткі. Змест тыпавой праграмы па методыцы выкладання гісторыі дазваляе вывучаць дысцыпліну па праблемным прынцыпе.

Кафедры ўстаноў вышэйшай адукацыі, што курыруюць выкладанне дадзенай дысцыпліны, распрацоўваюць вучэбныя праграмы з улікам тыпавой праграмы, а таксама ў рамках універсітэцкіх акадэмічных свабодаў. Вучэбныя праграмы адлюстроўваюць спецыфіку профілю ўстановы вышэйшай адукацыі, уласных навукова-метадычных пазіцый і прафесійнага вопыту прафесарска-выкладчыцкага калектыву.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для спецыяльнасці “Гісторыя (па напрамках)” адводзіцца 150 гадзін, з якіх 68 аўдыторных (42 гадзіны лекцыйныя і 26 – семінарскія заняткі), працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 4 заліковыя адзінкі; для спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)” – 156, з іх 68 аўдыторных (42 гадзіны лекцыйныя і 26 – семінарскія заняткі), працаёмкасць дысцыпліны – 4 заліковыя адзінкі, для спецыяльнасці “Гісторыка-архівазнаўства” – 160 гадзін, з іх 68 аўдыторных (42 гадзіны лекцыйныя і 26 – семінарскія заняткі), працаёмкасць дысцыпліны – 4,5 заліковыя адзінкі. Форма цякучай атэстацыі – экзамен.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

**Спецыяльнасць 1-21 03 01 Гісторыя (па напрамках)**

**Спецыяльнасць 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)**

**Спецыяльнасць 1-23 01 13 Гісторыка-архівазнаўства**

| № п/п | Назва раздзелаў | Аўды-торных | З іх | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Лекцыі | Семінары |
| 1. | Прадмет і задачы курса. Сучасныя праблемы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі | 6 | 4 | 2 |
| 2. | Фарміраванне гістарычных ведаў навучэнцаў. Храналогія і перыядызацыя ў гісторыі | 14 | 8 | 6 |
| 3. | Метады, прыёмы і сродкі навучання гісторыі | 14 | 8 | 6 |
| 4. | Формы арганізацыі працэса навучання гісторыі. Урок гісторыі | 10 | 6 | 4 |
| 5. | Развіццё пазнавальных здольнасцей і кампетэнцый вучняў у працэсе навучання гісторыі | 12 | 8 | 4 |
| 6 | Паўтарэнне, праверка, ацэнка і ўлік ведаў, уменняў і навыкаў вучняў | 6 | 4 | 2 |
| 7. | Пазаўрочна работа па гісторыі | 4 | 2 | 2 |
| 8. | Прафесійныя і асабістыя якасці настаўніка гісторыі | 2 | 2 | |
| | Усяго | **68** | **42** | **26** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ.

## Прадмет і задачы курса. Сучасныя тэндэнцыі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі

Методыка выкладання гісторыі як педагагічная навука. Прадмет методыкі. Мэты і задачы курса. Сувязь методыкі выкладання гісторыі з іншымі навукамі.

Асноўныя этапы развіцця гісторыка-метадалагічнай думкі ў XVII – XIX ст. Асаблівасці развіцця методыкі выкладання гісторыі ў XX – пачатку XXI ст. Галоўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі. Рэформы агульнаадукацыйнай школы і выкладання гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі". Мэта і задачы выкладання гісторыі ў школе. Кампетэнтнасны падыход у навучанні гісторыі ў школе. Прынцыпы пабудовы вучэбных праграм па гісторыі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Структура школьнага курса гісторыі. Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі".

## Фарміраванне гістарычных ведаў навучэнцаў. Храналогія і перыядызацыя ў гісторыі

Роля гістарычных ведаў у фарміраванні светапогляду навучэнцаў. Структура гістарычных ведаў. Асноўныя кампаненты вучэбнага гістарычнага матэрыялу і іх роля ў фарміраванні кампетэнцый навучэнцаў. Віды гістарычных уяўленняў. Улік узроставых асаблівасцей вучняў пры фарміраванні гістарычных уяўленняў.

Роля фактаў і вобразаў у навучанні гісторыі. Сутнасць катэгорыі "ўяўленне". Метадычныя сродкі і прыёмы фарміравання гістарычных уяўленняў аб фактах мінулага. Фарміраванне ўяўленняў аб гістарычных дзеячах.

Фарміраванне ўяўленняў аб гістарычным часе. Храналогія і перыядызацыя ў гісторыі. Класіфікацыя дат. Метадычныя сродкі і прыёмы фарміравання храналагічных ведаў і ўменняў навучэнцаў. Методыка арганізацыі замацавання і праверкі храналагічных ведаў і ўменняў вучняў.

Лакалізацыя гістарычных фактаў у прасторы. Гістарычная карта, яе нагрузка і віды. Методыка фарміравання ўяўленняў аб гістарычнай прасторы. Прыёмы працы з гістарычнай і контурнай картай. Асноўныя веды і ўменні вучняў пры рабоце з гістарычнай і контурнай картай.

Роля паняццяў у вывучэнні гісторыі. Класіфікацыя паняццяў. Асноўныя шляхі фарміравання гістарычных паняццяў. Роля ўяўленняў, тэрмінаў і азначэнняў у рабоце па фарміраванню паняццяў. Прыёмы работы з гістарычнымі паняццямі. Метадычныя прыёмы павышэння эфектыўнасці фарміравання гістарычных паняццяў.

Аб’ектыўныя гістарычныя сувязі і заканамернасці грамадскага развіцця як кампанент гістарычнага матэрыялу. Віды гістарычных сувязей: лакальныя, часавыя, прычынна-выніковыя. Паняцце аб заканамернасцях гістарычнага развіцця і спосабы падвядзення вучняў да іх засваення. Методыка працы з тэарэтычным матэрыялам на ўроках гісторыі.

Агульныя і спецыяльныя ўменні і навыкі ў навучання гісторыі. Характарыстыка спецыяльных гістарычных уменняў. Методыка і этапы фарміравання ўменняў у працэсе навучання гісторыі. Роля памятак у фарміраванні уменняў і навыкаў.

**Метады, прыёмы і сродкі навучання гісторыі**

Паняцце аб метадах навучання гісторыі. Праблема метадаў у метадычнай і педагагічнай літаратуры. Класіфікацыя метадаў. Суадносіны паняццяў “метад” і “прыём” навучання. Метады навучання гісторыі. Сродкі навучання гісторыі як крыніцы гістарычных ведаў. Крытэрыі выбару метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання.

Метад славеснага навучання гісторыі. Функцыі вуснага слова. Характарыстыка асноўных прыёмаў славеснага навучання гісторыі. Патрабаванні да вуснага выкладання вучэбнага матэрыялу.

Падручнік (вучэбны дапаможнік) па гісторыі як крыніца і сродак арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Структурныя кампаненты і функцыі падручніка па гісторыі. Асноўныя патрабаванні да сучаснага падручніка па гісторыі. Прыёмы работы з падручнікам. Фарміраванне ў вучняў умення самастойна працаваць з тэкстам падручніка (вучэбнага дапаможніка), дадатковай літаратурай, дадатковымі крыніцамі інфармацыі.

Роля гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі. Віды гістарычных дакументаў. Тыпы пытанняў да першакрыніц. Асноўныя прыёмы выкарыстання дакументаў у навучанні гісторыі.

Асаблівасці выкарыстання навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры пры навучанні гісторыі. Методыка работы з медыятэкстамі на ўроках гісторыі.

Нагляднасць як сродак навучання гісторыі. Класіфікацыя наглядных сродкаў навучання. Правілы адбору і дэманстрацыі наглядных дапаможнікаў. Метадычныя прыёмы нагляднага навучання. Методыка выкарыстання вучэбных карцін, ілюстрацый, гістарычнага партрэта, карыкатур, плакатаў, фотаздымкаў на ўроках гісторыі. Умоўна-графічная нагляднасць у навучанні гісторыі і асаблівасці яе выкарыстання. Віды ўмоўна-графічнай нагляднасці. Прыёмы работы з крэйдавым малюнкам, скрайбінгам, табліцамі, дыяграмамі, схемамі, лагічнымі ланцужкамі, гексамі, ментальнымі картамі, інфаграфікай і інш. Методыка выкарыстання аўдыёвізуальных сродкаў і камп’ютарных праграм на ўроках гісторыі. Методыка выкарыстання сэрвісаў Вэб 2.0 у навучанні гісторыі.

Інтэрактыўнае ўзаемадзеянне ў працэсе навучання: сутнасць, прыкметы і прызначэнне. Класіфікацыя і характарыстыка інтэрактыўных метадаў навучання. Асаблівасці іх выкарыстання ў працэсе навучання гісторыі.

## Формы арганізацыі працэса навучання гісторыі. Урок гісторыі

Урок як асноўная форма арганізацыі навучання гісторыі. Сучасныя патрабаванні да ўрока гісторыі. Структура ўрока. Улік узроставых, індывідуальных і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў у арганізацыі працэса навучання.

Тыпалогія ўрокаў. Залежнасць структуры ўрока ад яго тыпа. Мэта і задачы ўрока, спосаб іх вызначэння. Выбар тыпу і формы ўрока. Арганізацыя праверкі ведаў і ўменняў вучняш. Падрыхтоўка навучэнцаў да ўспрымання новага матэрыялу. Фарміраванне новых гістарычных ведаў. Арганізацыя асэнсавання і замацавання ведаў. Арганізацыя працы вучняў па прымяненні засвоеных ведаў і ўменняў. Дамашняе заданне.

Планаванне вывучэння гісторыі ў школе. Методыка састаўлення каляндарна-тэматычнага плана. Састаўленне плана і плана-канспекта ўрока гісторыі. Структурныя элементы плана-канспекта ў залежнасці ад тыпу ўрока.

Аналіз урока гісторыі. Асноўныя крытэрыі ацэнкі якасці ўрока.

Інтэрактыўныя формы арганізацыі адукацыйнага працэсу: лекцыя, семінарскі занятак, дыскусія, дыдактычная гульня і інш. Школьная лекцыя і патрабаванні да яе. Тыпы школьных лекцый. Методыка правядзення семінарскіх заняткаў у установах агульнай і сярэдняй адукацыі. Асаблівасці вучэбнай дыскусіі як формы навучання гісторыі і правілы яе правядзення. Характэрныя рысы дыдактычнай гульні. Класіфікацыя гістарычных гульняў і асаблівасці іх выкарыстання на ўроках гісторыі.

Сучасныя педагагічныя тэхналогіі, накіраваныя на развіццё асобы вучня: сутнасць, функцыі, прыкметы. Патрабаванні да педагагічных тэхналогій. Характарыстыка асноўных тэхналогій: модульнае навучанне, праблемнае навучанне, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, праектныя тэхналогіі і інш.

## Развіццё пазнавальных здольнасцей і кампетэнцый вучняў у працэсе навучання гісторыі

Узроставыя асаблівасці вучняў як фактар арганізацыі пазнавальнага працэса. Характэрныя рысы развіваючага навучання. Формы арганізацыі актыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Развіццё гістарычнага мыслення. Выкарыстанне спецыяльных памятак пры фарміраванні ўменняў. Віды засваення ведаў. Асаблівасці падачы матэрыялу ў гатовым выглядзе. Праблемна-пошукавы шлях выкладання і яго асаблівасці. Прыёмы актывізацыі ўвагі вучняў пад час урока. Методыка арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў з крыніцамі інфармацыі. Веданне вучнямі асноўных відаў крыніц, іх спецыфікі і формы, спосабаў працы з імі.

Асаблівасці арганізацыі даследчай работы навучэнцаў па гісторыі. Формы даследчай работы вучняў. Паслядоўнасць арганізацыі вучнёўскай даследчай работы. Праектная дзейнасць вучняў і асаблівасці яе арганізацыі.

Развіццё кампетэнцый вучняў у працэсе навучання гісторыі. Арганізацыя праектнай і пошукавай працы вучняў. Выкарыстанне рознаўзроўневых заданняў. Фарміраванне вучэбна-пазнавальных кампетэнцый вучняў праз выкарыстанне гісторыка-краязнаўчага кампанента.

## Паўтарэнне, праверка, ацэнка і ўлік ведаў, уменняў і навыкаў вучняў

Прызначэнне паўтарэння. Асноўныя віды паўтарэння. Асаблівасці арганізацыі і метадычныя ўмовы павышэння эфектыўнасці паўтарэння на ўроках гісторыі.

Сутнасць праверкі ведаў, уменняў і кампетэнцый вучняў. Асноўныя віды і формы праверкі ведаў. Методыка арганізацыі праверкі ведаў. Асаблівасці правядзення індывідуальнага, групавога і франтальнага апытання. Арганізацыя рознаўзроўневай праверкі ведаў і яе асаблівасці. Улік праграмных патрабаванняў пры праверцы ведаў і ўменняў. Ацэнка, каменціраванне і ўлік ведаў. Крытэрыі выстаўлення адзнак па гісторыі на ўроку, за чвэрць/трыместр, паўгоддзе, год. Патрабаванні да афармлення класнага журнала.

Выніковая праверка ведаў. Падрыхтоўка вучняў да экзамена па гісторыі. Асаблівасці правядзення экзамена па гісторыі Беларусі. Падрыхтоўка навучэнцаў да цэнтралізаванага тэсціравання.

## Пазаўрочная работа па гісторыі

Асаблівасці і арганізацыя пазаўрочнай работы ў установах агульнай сярэдняй адукацыі. Асноўныя віды пазаўрочнай работы. Інтэлектуальныя гульні.

Змест пазаўрочнай работы па гісторыі. Гістарычныя канферэнцыі, тэматычныя вечары, алімпіяды па гісторыі. Прадметныя тыдні. Гістарычныя гурткі. Конкурсы эрудытаў. Экскурсія і методыка яе арганізацыі. Методыка арганізацыі краязнаўчай работы. Стварэнне школьных музеяў. Кабінет гісторыі ў школе.

## Прафесійныя і асабістыя якасці настаўніка гісторыі

Роля настаўніка гісторыі ў навучальным і выхаваўчым працэсе. Асноўныя патрабаванні да прафесійнай дзейнасці настаўніка. Прафесійныя кампетэнцыі настаўніка. Умовы творчага і прафесійнага росту. Аналіз і абагульненне перадавога вопыту. Сістэма павышэння кваліфікацыі настаўніка гісторыі.

Педагагічныя паводзіны настаўніка. Сутнасць педагагічнага такту і ўменне яго прытрымлівацца. Знешні выгляд і агульная культура настаўніка.

Характэрныя недахопы пачынаючага настаўніка. Змест работы класнага кіраўніка.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

## АСНОЎНАЯ


1. Багдановіч, І. І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / І. І. Багдановіч. — Мн.: БДПУ, 2009. — 284 с.
2. Вяземский, Е. Е. Методика преподавания истории в школе: практическое пособие / Е. Е. Вяземский, О. Ю. Стрелова. — М.: Владос, 1999. — 175 с.
3. Вяземский, Е.Е. Теория и методика преподавания истории / Е. Е. Вяземский, О. Ю. Стрелова. — М.: Владос, 2003. — 382 с.
4. Давідоўская, Г. Э. Фарміраванне вобразных уяўленняў у вучняў 6-7 класаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі / Г.Э. Давідоўская, З. Я. Вінаградава; пад рэд. С. В. Панова. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2019. – 151 с.
5. Корзюк, А. А. Выкарыстанне гістарычных крыніц на ўроках гісторыі і грамадазнаўства: вуч.-мед. дапаможнік для настаўнікаў / А. А. Корзюк. – Мінск: Выд. Цэнтр БДУ, 2016. – 168 с.
6. Корзюк, А. А. Изучение вопросов культуры на уроках истории Нового времени в 7 классе: пособие для учителей учреждений среднего образования с белорусским и русским языками обучения / А. А. Корзюк. – Минск: Издательский центр БГУ, 2018. – 134 с.
7. Корзюк, А. А. Изучение вопросов культуры на уроках истории Нового времени в 8 классе: пособие для учителей учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / А. А. Корзюк. – Минск: Издательский центр БГУ, 2019. – 182 с.
8. Корзюк, А. А. Изучение вопросов культуры на уроках истории Средних веков в 6 классе: пособие для учителей учреждений среднего образования с белорусским и русским языками обучения / А. А. Корзюк. – Минск: Издательский центр БГУ, 2017. – 127 с.
9. Короткова, М. В. Наглядность на уроках истории / М. В. Короткова. — М.: Владос, 2000. — 176 с.
10. Кудраўцава, С. А. Вывучэнне пытанняў культуры на ўроках гісторыі Беларусі ў 6 класе / С. А. Кудраўцава. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2017. – 175 с.
11. Кудраўцава, С. А. Вывучэнне пытанняў культуры на ўроках гісторыі Беларусі ў 7 класе / С. А. Кудраўцава. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2018. – 183 с.
12. Палейка, А. А. Медыятэксты ў навучанні гісторыі і грамадазнаўству / А. А. Палейка. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2018. – 96 с.
13. Степанищев, А.Т. Методика преподавания и изучения истории: учебное пособие для студентов ВУЗ: В 2 ч. / А. Т. Степанищев. — М.: Владос, 2002. — Ч. 1. — 304 с.; Ч. 2. — 208 с.

14. Степанищев, А.Т. Настольная книга преподавателя истории. Учебно-методическое пособие /А.Т. Степанищев. – М.: Гуманитарный изд. центр ВЛАДОС, 2013. – 376 с.
15. Студеникин, М.Т. Методика преподавания истории в школе / М. Т. Студеникин. — М.: Владос, 2000. — 238 с.
16. Шогин, В.В. Методика преподавания истории в школе: новая технология личностно-ориентированного исторического образования: учебное пособие /В.В. Шогин. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2007. — 475 .

## ДАДАТКОВАЯ

1. Борзова, Л. И. Игры на уроке истории: Методическое пособие для учителя / Л. И. Борзова. — М.: Владос-Пресс, 2001. — 160 с.
2. Вагин, А.А. Методика обучения истории в школе / А. А. Вагин. — М.: Просвещение, 1972. — 351 с.
3. Войтов, А. Г. Учебная наглядность /А.Г. Войтов. — М.: Издательско-торговая корпорация «Дашков и К*», 2013. — 238 с.
4. Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання. Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі. V—XI класы. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012. —
5. Гин, А. А. Приемы педагогической техники: Свобода выбора. Открытость. Деятельность. Обратная связь. Идеальность: Пособие для учителей / А.А. Гин. — М.: Вита-Пресс, 2001. — 88 с.
6. Гончарова, Т.И. Исторические вечера в школе: Книга для учителя. Из опыта работы / Т. И. Гончарова. — М.: Просвещение, 1992. — 159 с.
7. Гора, П. В. Методические приемы и средства наглядного обучения истории в средней школе: Пособие для учителей / П. В. Гора. — М.: Просвещение, 1971. — 239 с.
8. Григальчик, У. К. Обучаем иначе: Стратегия активного обучения в школе / У. К. Григальчик, Д. И. Губаревич [и др.]. — Минск: БИП-С, 2003. — 182 с.
9. Грицевский, И.М. Работа учителя с учебником при подготовке к уроку истории: Из опыта работы / И. М. Грицевский. — М.: Просвещение, 1987. — 80 с.
10. Кабанова-Меллер, Е. Н. Учебная деятельность и развивающее обучение / Е. Н. Кабанова-Меллер. — М.: Знание, 1981. — 96 с.
11. Казак, Д. Я. Школьная лекция: Методические рекомендации / Д. Я. Казак. — Мн.: РИУУ, 1986. — 24 с.
12. Кашлев, С. С. Интерактивные меоды обучения: учеб.-мет. пособие / С. С. Кашлев. — Мн.: ТетраСистемс, 2013. — 222 с.
13. Кодекс Республики Беларусь об образовании. — Минск: РИВШ, 2011. — 352 с.
14. Концепция учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси»: утв. приказом Министерства Респ. Беларусь от 29.05.2009 №675 // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2009. — №7.

15.Корзюк, А. А. Выкарыстанне дакументальнага матэрыялу пры вывучэнні гісторыі і грамадазнаўства / А.А. Корзюк, Н.А. Дзямідава; ДУА “Мін. абл. ін-т развіцця адукацыі”. — Мінск: Мін. абл. ІРА, 2012. — 117 с.
16.Корзюк, А. А. Изучение вопросов культуры и религии на уроках истории Древнего мира в 5-м классе: учебно-метод. пособие для учителей / А. А. Корзюк. — Минск: Изд. центр БГУ, 2016. – 131 с.
17.Корзюк, А. А. Формирование устойчивого познавательного интереса учащихся 8—9 классов к изучению истории Беларуси: пособие для учителей / А. А. Корзюк. — Минск, 2016. — 96 с.
18.Короткова, М. В. Методика обучения истории в схемах, таблицах, описаниях / М. В. Короткова, М. Т. Студеникин. — М.: Владос, 1999. — 191 с.
19.Короткова, М. В. Методика проведения игр и дискуссий на уроках истории / М. В. Короткова. — М.: Владос, 2003. — 252 с.
20.Кулагина, Г.А. Сто игр по истории: Пособие для учителя / Г. А. Кулагина. — М.: Просвещение, 1983. — 240 с.
21.Левитес, Д. Г. Школа для профессионалов, или Семь уроков для тех, кто учит / Д. Г. Левитес. — М.—Воронеж: Московский психолого-социальный институт, 2001. — 256 с.
22.Лернер, И. Я. Развитие мышления учащихся в процессе обучения истории / И. Я. Лернер. — М.: Просвещение, 1982. — 191 с.
23.Магчымасці рэалізацыі педагагічных тэхналогій: вопыт работы настаўніка гісторыі: вуч.-мет. дапаможнік [склад. В.А. Глінская]. – Мн.: МАІРА, 2009. – 127 с.
24.Малахов, Н. В. Межпредметные связи в формировании картографических знаний учащихся / Н. В Малахов. — М.: Просвещение, 1982. — 128 с.
25.Маркова, А. К. Формирование мотивации учения: Книга для учителя / А.К. Маркова. — М.: Просвещение, 1990. — 192 с.
*26.*Никифоров, Д. Н. Наглядность в преподавании истории и обществоведения / Д. Н. Никифоров, С. Ф. Скляренко. — М., 1978. — 319 с.
27.Нормы оценки результатов учебной деятельности учащихся общеобразовательных учреждений по учебным предметам. Оценка результатов учебной деятельности учащихся по учебному предмету «Всемирная история. История Беларуси» // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2009. — №7.
28.Образовательный стандарт учебного предмета «Всемирная история. История Беларуси»: утв. постановлением Министерства Республики Беларусь от 29.05.2009 №32 // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2009. — №7.
29.Озерский, И.З. Начинающему учителю истории: Из опыта работы / И.З. Озерский. — М.: Просвещение, 1987. — 208 с.
30.Селевко, Г. К. Современные образовательные технологии: Учебное пособие / Г. К. Селевко. — М.: Народное образование, 1998. — 208 с.

31. Снопкова, Е.И. Образовательные технологии в преподавании истории (Опыт методического обеспечения образовательной практики) / Е. И. Снопкова. – Могилев: ИПК и ПРР и СО, 2001. – 28 с.
32. Третьяков, П. И. Технология модульного обучения в школе. Практико-ориентированная монография / П. И. Третьяков, И. Б. Сенновский. — М.: Новая школа, 2001.— 352 с.
33. Часопісы: Беларускі гістарычны часопіс, Гісторыя: праблемы выкладання, Гісторыя і грамадазнаўства, Преподавание истории в школе, Школьные технологии, Преподавание истории и обществознания в школе і інш.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТ НАВУЧЭНЦАЎ

Важную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй адыгрывае выкарыстанне кампетэнтнаснага падыходу, які істотна ўзмацняе практычную арыентаванасць адукацыйнага працэсу і павялічвае ролю кіруемай самастойнай працы студэнтаў. Кіруемая самастойная работа студэнтаў арганізуецца рэктаратамі, дэканатамі, кафедрамі, выкладчыкамі устаноў вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб самастойнай рабоце студэнтаў, распрацаваным установай вышэйшай адукацыі. Пры гэтым патрэбна кіравацца патрабаваннямі Адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі па адпаведнай спецыяльнасці, а таксама накопленым ў Рэспубліцы Беларусь і асобных установах вышэйшай адукацыі вопытам выкладання вывучаемай дысцыпліны.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне практычных заданняў і кантрольных работ, здачу прамежкавых залікаў і калоквіўмаў, напісанне рэфератаў, азнаямленне з вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратурай, выкананне вучэбна-даследчыцкіх прац, стварэнне прэзентацый, электронных вучэбна-метадычных матэрыялаў і інш.

Па кожным вучэбным раздзеле, у адпаведнасці з яго мэтай і задачамі па фарміраванню і развіццю ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый, выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца разнастайныя педагагічныя тэхналогіі. У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, што спрыяюць актывізацыі пазнавальнай творчай дзейнасці навучэнцаў, набыццю імі вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, варта вылучыць:

— тэхналогіі праблемнага навучання;
— тэхналогіі модульна-рэйтынгавага навучання;
— метад праектаў ці праектныя тэхналогіі;
— камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, вучэбныя дэбаты і інш.);
— гульневыя тэхналогіі (арганізацыя і правядзенне дзелавых, ролевых, імітацыйных гульняў і інш.).

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваюць наступныя формы: вусная, пісьмовая і пісьмова-вусная, тэхнічная форма.

Вусная форма прадугледжвае выкарыстанне такіх формаў кантроля як суразмоўе, паведамленні на семінарскіх занятках, удзел у дыскусіях, прэзентацыя і наступнае абмеркаванне фрагментаў урока на семінарскіх занятках, падрыхтоўка і абарона заданняў, звязаных з выкарыстаннем вобразаў пры навучанні гісторыі, заданняў па развіцці медыяадукацыйных кампетэнцый інш.

Пісьмая форма прадугледжвае пісьмовае выкананне практычных заданняў, напісанне кантрольных прац і інш. Пісьмова-вусная форма можа выкарыстоўвацца на экзамене па выніках праходжання дысцыпліны.

Да тэхнічнай формы дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў адносяцца электронныя прэзентацыі, у тым ліку пры выкананні практычных заданняў, выкананне заданняў з выкарыстаннем сэрвісаў Web 2.0 і інш.

## ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПАДЫХОДЫ І МЕТАДЫ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Пры арганізацыі адукацыйнага працэса рэкамендавана выкарыстоўваць:

✓ **практыка-арыентаваны падыход**, які прадугледжвае:
- засваенне зместа адукацыі праз вырашэнне практычных задач,
- выпрацоўку навыкаў эфектыўнага выканання розных відаў прафесійнай дзейнасці,
- арыентацыю на генераванне ідэй, рэалізацыю праектаў,
- выкарыстанне працэдур, спосабаў ацэньвання, якія фіксуюць сфарміраванасць прафесійных кампетэнцый;

✓ **эўрыстычны падыход**, які прадугледжвае:
- ажыццяўленне студэнтамі асобасна-значных адкрыццяў навакольнага свету,
- дэманстраванне разнастайнасці рашэнняў большасці прафесійных задач і жыццёвых праблем,
- творчую самарэалізацыю навучэнцаў у працэсе стварэння адукацыйных прадуктаў,
- індывідуалізацыю навучання праз магчымасць самастойна ставіць мэты, ажыццяўляць рэфлексію ўласнай адукацыйнай дзейнасці;

✓ **метад аналіза канкрэтных сітуацый**, які прадугледжвае:
- назапашванне студэнтамі ведаў і уменняў для вырашэння практычных задач,

- аналіз сітуацыі з выкарыстаннем прафесійных ведаў, уласнага досведу, дадатковай літаратуры і іншых крыніц;

✓ **метад дзелавой гульні**, які прадугледжвае такую форму арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, дзе функцыянуюць розныя тыпы малых груп, якія працуюць як над агульнымі, так і спецыфічнымі вучэбнымі заданнямі. У працэсе дзелавых гульняў студэнты назапашваюць канкрэтны прафесійны вопыт, развіваюць творчае мысленне, атрымліваюць досвед сацыяльных адносін.